***В. А. Сцепчанка***
*Навук. кір.* ***К. Л. Хазанава,***
*канд. філал. навук, дацэнт*

## МЕТАДЫ АКТЫЎНАГА НАВУЧАННЯ НА ЎРОКАХ БЕЛАРУСКАЙ ЛІТАРАТУРЫ

На ўроках беларускай літаратуры можна найбольш поўна раскрыць творчы патэнцыял і асобу кожнага вучня, развіць яго памяць, зразумець, як ён глядзіць на свет вакол сябе і мастацтва.

Адзін з варыянтаў выкарыстання актыўных метадаў навучання на ўроках беларускай літаратуры – напісанне сачынення па прапанаванай настаўнікам або праграмай навучання тэме. Часцей за ўсё гэта агульныя тэмы, звязаныя з любоўю да роднага краю, сяброўствам, каханнем і г. д. Дадзеныя тэмы дапамагаюць у развіцці слоўнікавага запасу вучня, вучаць правільна фарміраваць і выказваць свае думкі, а таксама разважаць на важныя тэмы, што можа спатрэбіцца вучням у іх будучым жыцці.

Другі варыянт – напісанне сачынення па прачытаным творы. У дадзеным выпадку вучні выказваюць свае думкі наконт пройдзенага апавядання, верша і не толькі. Гэты метад спрыяе разуменню вучнямі сваіх ўражанняў ад прачытанага твора і дапамагае настаўніку ўбачыць ступень зацікаўленасці вучняў, іх разуменне і адносіны да пэўнага твора.

Трэці варыянт – напісанне вучнямі працягу гісторыі або пераробка ўжо існуючых частак. Гэта дапамагае развіваць у вучняў крытычнае мысленне і творчыя здольнасці, вучыць шукаць новыя рашэнні ў розных сітуацыях і аналізаваць іх.

Пераказ прачытанага твора таксама можа з’яўляцца метадам актыўнага навучання, але варта адзначыць, што распаўсюджваецца гэта толькі на такі від пераказу, як мастацкі аповед. Мастацкі аповед спрыяе развіццю творчых здольнасцей вучня, бо, у адрозненне ад стандартнага пераказу, яно з’яўляецца больш свабоднай яго формай.

Адным з метадаў актыўнага навучання, прымяняльным на ўроках беларускай літаратуры, з’яўляецца стварэнне вучнямі або настаўнікам загадак, шарад, крыжаванак па зададзенай тэме. Гэта развівае мысленне вучняў, вучыць іх прымаць хуткія рашэнні і ствараць фармуліроўкі, якія будуць змястоўна і каротка выкладаць сваю думку.

Такім чынам, прымяненне актыўных метадаў навучання на ўроках беларускай літаратуры паспрыяе зацікаўленасці навучэнцаў прадметам, павысіць матывацыю навучання, будзе садзейнічаць развіццю кругагляду вучняў.

***А. В. Титовец***
*Науч. рук.* ***Н. И. Лапицкая,***
*канд. филол. наук, доцент*

## ПРОБЛЕМА ФОРМИРОВАНИЯ ОРФОГРАФИЧЕСКОЙ ЗОРКОСТИ У СОВРЕМЕННЫХ ШКОЛЬНИКОВ

В настоящее время проблема выработки навыка орфографической зоркости у школьников стоит особенно остро. Под орфографической зоркостью мы понимаем умение видеть орфограмму при написании разных слов и форм слова.

Орфографическая зоркость формируется путём использования различных методов и упражнений разных типов. С поисками наиболее результативной системы орфографических упражнений и связаны усилия тех, кто занимается проблемами обучения правописанию.

На наш взгляд, основными и самыми эффективными методами по выработке орфографической зоркости являются следующие: комментированное письмо – помогает учащимся самостоятельно объяснить написание орфограммы; письмо с проговариванием – помогает избежать ошибок и объединяет класс; письмо с пропуском орфограммы – позволяет пропустить место орфограммы в слове и после вернуться к её объяснению; какографическая работа – формирует навык находить ошибки в уже готовом тексте; различные виды списывания (осложнённое или неосложнённое); различные виды обучающих диктантов (предупредительный, объяснительный, словарный, выборочный и др.); работа со словарными словами и работа над ошибками; орфографический разбор.

Каждый из этих методов подходит для конкретной ситуации на уроке русского языка.

Следует отметить, что «орфографическая зоркость формируется, развивается постепенно, в процессе языкового анализа и синтеза, выделения звуков и букв, морфем при чтении, при письме диктантов, при списывании, если оно осложнено заданиями. При систематической отработке зоркость становится компонентом навыка орфографии, обеспечивает успешное выполнение первых этапов орфографического действия: нахождения и опознавания орфограммы» [1, с. 115–117].

**Литература**

1 Коваль, Н. А. Проблема формирования орфографической зоркости на уроке русского языка [Электронный ресурс] / Н. А. Коваль // Молодой ученый. – 2022. – № 46 (441). – С. 115–117. – Режим доступа: https://moluch.ru/archive/441/96318/. – Дата доступа: 16.05.2023.

***К. В. Уніятава***
*Навук. кір.* ***А. В. Брадзіхіна,***
*канд. філал. навук, дацэнт*

## ВОБРАЗ ІНТЭЛІГЕНТА Ў ПОЗНІХ АПОВЕСЦЯХ ІВАНА ШАМЯКІНА

Складаныя і супярэчлівыя змены ў грамадстве канца 1980 – пачатку 90-х гадоў былі ўспрыняты пісьменнікам неадназначна. Мастак сацыялістычнага светапогляду, ён не разумее і не прымае новых адносін паміж людзьмі. Шамякіна-пісьменніка пакідае гістарычны аптымізм, які быў уласцівы ўсёй яго папярэдняй творчасці. Вялікая роля ў позніх аповесцях І. Шамякіна належыць вобразам герояў-інтэлігентаў (мастакоў, артыстаў, вучоных). Яны людзі неабыякавыя, балюча перажываюць тое, што здарылася з некалі вялікай краінай і што адбываецца навокал. Галоўны герой твораў “Paradies auf erden” і “Вернісаж” – пісьменнік-інтэлігент Іван Андрэевіч – так характарызуе сучаснае яму грамадства: “Хаос. Не, не хаос. У хаосе ёсць завяршэнне, пачатак і канец… А я не бачу канца нашага развалу. Чым далей, тым большая памыйка” [1, с. 261]. Прататыпам гэтага героя з’яўляецца сам Іван Пятровіч Шамякін, а персанаж – немалады ўжо пісьменнік – становіцца яго аўтарскім голасам. Ён агучвае сваё разуменне творчых праблем, сучаснай яму рэчаіснасці.

Запыт на духоўнасць у тагачасным грамадстве імкнуўся да нулю, таму пісьменнік паказвае болевыя кропкі соцыуму праз герояў-інтэлігентаў, якія апынуліся ў цяжкіх умовах жыцця на гістарычным раздарожжы. Так, герой-пісьменнік Іван Андрэевіч з аповесці “Paradies auf erden” змушаны гандляваць на праспекце аўтарскімі экземплярамі кніг, вядомы мастак Міхаіл Рачыцкі – прадаваць свае карціны ў замежжа (“Вернісаж”), а народная артыстка зноў просіцца выйсці на тэатральныя падмосткі, каб зарабіць на